ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК
Г. МІНСКА

АДДЗЕЛ ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ

# *Цётка*

***(Алаіза Пашкевіч)***

***Да 150-годдзя з дня нараджэння***



*Бібліяграфічны спіс*

Мінск 2026

# Прадмова



**Біяграфія**

Цётка (сапр. імя – Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч; 1876–1916) – беларуская пісьменніца, грамадскі і палітычны дзеяч, публіцыст.

Нарадзілася 3 (15) ліпеня 1876 года ў фальварку Пешчын Лідскага павета Віленскай губерні (цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці) у шматдзетнай шляхецкай сям’і Стафана і Ганны Пашкевічаў. Пэўны час будучая пісьменніца выхоўвалася ў дзеда і бабулі ў фальварку Тарэсін, дзе навучылася чытаць і пісаць па-польску. Пасля смерці бабулі дзевяцігадовую Алаізу бацькі забралі да сябе ў Стары Двор, дзе яе выхаваннем займалася простая сялянка – бабка Ягася. Ад старой нянькі, якая ведала шмат казак і песень, будучая беларуская паэтка пераняла любоў да жывой народнай творчасці. Любоў да кнігі ёй таксама прывіла Вера Тацішчава, якая на працягу года працавала хатняй настаўніцай у сям’і Пашкевічаў. У 16-гадовым узросце Алаіза пераехала ў Вільню да сястры. Праз два гады, у 1894 г., паступіла у чацвёрты клас прыватнай жаночай гімназіі Веры Прозаравай у Вільні, дзе яна хутка знайшля аднадумцаў сярод гімназістаў, якіх аб’ядноўвала любоў да беларускай мовы. Аднак вучобе ўжо тады перашкаджала хвароба – сухоты, якія нагадвалі пра сябе ўсё жыццё. У 1902 годзе Цётка атрымала пасведчанне на званне хатняй настаўніцы і паступіла на Вышэйшыя адукацыйныя курсы П.Ф. Лесгафта ў Пецярбургу (1902–1904), дзе ў гэты час ўжо арганізацыйна аформіўся і дзейнічаў гурток студэнтаў-беларусаў «Круг беларускай народнай прасветы», удзельніцай якога была і Цётка. Яна становіцца свядомай дзяячкай нацыянальна-вызваленчага руху, актывізаванага рэвалюцыйнай барацьбой супраць царскага самаўладдзя, сябрам першай беларускай рэвалюцыйнай партыі «Беларуская сацыялістычная грамада» (БСГ). У 1903 годзе Алаіза пачала публікаваць свае творы. Яе першыя вершы былі надрукаваныя пад псеўданімам Банадысь Асака, і ўжо ў 1904 годзе выйшаў фальклорны зборнік «Песні», у якім змяшчаўся яе верш «Мужыцкая доля». Гэтыя творы былі накіраваны на падтрыманне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і крытыкавалі цяжкую долю сельскага працоўнага класа.У 1904 г. Цётка здала экстэрнам экзамены за поўны курс у Аляксандраўскай жаночай гімназіі (Пецярбург), але напярэдадні рэвалюцыйных падзей яна вярнулася з Пецярбурга ў Вільню і распачала актыўную прапагандысцкую працу сярод віленскіх рабочых. На кватэры ў Вільні Цётка ладзіла канферэнцыі Беларускай сацыялістычнай грамады, тут віленскім краёвым камітэтам БСГ былі ананімна надрукаваны тры вершы Цёткі – «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандарам». Цётка прымала ўдзел ў жаночым з'ездзе ў Маскве (май 1905 г.) як «дэлегатка ад беларускіх жанчын». Але пасля рэпрэсій, звязаных з рэвалюцыяй, Пашкевіч была вымушаная жыць на нелегальным становішчы. Яна эмігрыравала ў Галіцыю, дзе працягнула сваю адукацыю: наведвала заняткі ў Ягелонскім (Кракаў) і Львоўскім універсітэтах, займаючыся даследаваннямі па гісторыі беларускага тэатра і фальклору. У 1906 годзе яна пераклала на беларускую мову ўкраінскую дзіцячую чытанку «Гасцінец для малых дзяцей». Акрамя таго, Цётка актыўна ўдзельнічала ў стварэнні нелегальных беларускіх школ і настаўніцкіх курсаў. Звярнуўшыся на Бацькаўшчыну ў 1910 г. Цётка прыняла ўдзел у стварэнні беларускага тэатра І. Буйніцкага, бо разглядала сцэнічнае мастацтва як сродак абуджэння народа да свядомага культурнага жыцця. Яна сама была выдатнай драматычнай актрысай, і сама іграла ў тэтры пад тэатральным псеўданімам М.Крапівіха.

У 1911 годзе Алаіза Пашкевіч выйшла замуж за літоўскага інжынера Сцяпонаса Кайрыса. У 1912 годзе яна змагла адкрыць беларускую школу ў Вільні, і з гэтага часу яе жыццё і творчасць былі звязаны з актыўнай грамадскай дзейнасцю. У 1914 годзе Пашкевіч стала галоўнаю рэдактаркаю першага беларускамоўнага дзіцячага часопіса «Лучынка».

Падчас Першай сусветнай вайны яна працавала міласэрнаю сястрою ў Віленскім вайсковым шпіталі, дапамагаючы хворым.

Алаіза Пашкевіч памерла 5 (18) лютага 1916 года ад тыфу ў Лідскім павеце. Яе спадчына засталася не толькі ў беларускім нацыянальным руху, але і ў беларускай літаратуры. Творы Цёткі ўнеслі вялікі ўклад у развіццё беларускай паэзіі і публіцыстыкі, у іх адлюстроўваюцца ідэі сацыяльнай справядлівасці, нацыянальнага адраджэння і любові да радзімы.

Бібліяграфічны спіс «Цётка (Алаіза Пашкевіч). Да 150-годдзя з дня нараджэння» знаёміць з матэрыяламі аб жыцці і творчасці выдатнай беларускай пісьменніцы, а таксама яе творамі, якія знаходзяцца ў фондах дзяржаўнай установы «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібілятэк г. Мінска».

У кожным з раздзелаў спіска спачатку пададзены кнігі, затым артыкулы са зборнікаў і часопісаў. Матэрыял размешчаны — кнігі ў алфавіце, артыкулы ў зваротна-храналагічным парадку.

Бібліяграфічны спіс разлічаны на шырокае кола чытачоў.

Змест

[Творы Цёткі (А. Пашкевіч)](#)
[Творы Цёткі ў зборніках](#)
[Жыццёвы і творчы шлях пісьменніцы](#)

## Творы Цёткі (А. Пашкевіч)

**Цётка.** Вершы і апавяданні : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Пашкевіч А. (Цётка). — Мінск : Сталія, 2003. — 104 с.

**Цётка.** Вершы / А. Пашкевіч (Цётка). — Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. — 301, [1] с.

**Цётка.** Вершы і апавяданні : [для старэйшага школьнага ўзросту] / А. Пашкевіч (Цётка). — Мінск : Юнацтва, 1990. — (Паэтычная бібліятэка). — 108 с.

**Цётка.** Выбраныя творы / Цётка. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2001. — 333 с.

**Цётка.** Выбраныя творы / Цётка. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1952. – 146, [1] с.

**Цётка.** Выбраныя творы / Цётка. — Мінск : Маст. літ., 2016. — 196, [1] с.

**Цётка.** Выбраныя творы : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Цётка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2010. — (Школьная бібліятэка). — 196, [1] с.

**Цётка.** Першае чытанне для дзетак беларусаў : [вершы, апавяданні, казкі, загадкі] / напісала Цйотка. — Мінск : Юнацтва, 1992. — 29, [3] с.

**Цётка.** Выбраныя творы / Цётка. — Мінск : Беларусь, друк, 1967. — 165, [3] с.

**Цётка.** Выбраныя творы : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Цётка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2010. — 196, [1] с. — (Школьная бібліятэка).

*змест*

## Творы Цёткі ў зборніках

**Волшебная криничка** : фольклор, стихи, рассказы : [для дошкольного и младшего школьного возраста / составитель П. А. Кошель. — Минск : Юнацтва, 1997. — 302, [1].

*Стихи Тетки (Э. Пашкевич) “Воскресенье” на с. 45, “Сынок маленький” на с. 183—184, “Цыган” на с. 59—61.*

**Тетка.** Избранное : [для старшего школьного возраста: перевод с белорусского] / Тетка. — Мінск : Юнацтва, 1987. — 222 с.

**Тетка.** Избранное : перевод с белорусского / Тетка. — Москва : Художественная литература, 1976. — 220, [1] с.

*змест*

**Жыццёвы і творчы шлях пісьменніцы**

**Акрыленыя родным словам** = Окрилені рідним словом : Ларыса Косач-Квітка (Леся Украінка) і Алаіза Пашкевіч (Цётка) : [зборнік / укладальнікі: І. Башняк і інш. ; пад навуковай рэдакцыяй Ю. Громіка, С. Раманава, Т. Данілюк-Церашчук]. — Мінск : Звязда, 2021. — 166, [1] с.

**Александровіч, С. Х.** Тут зямля такая...: [літаратурна-крытычныя артыкулы] / Сцяпан Александровіч. — Мінск : Нар. асвета, 1974. — 270, [2] с.

**Александровіч, С. Х.** Тут зямля такая...: [нарысы : для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Сцяпан Александровіч. — Мінск : Нар. асвета, 1985. — 256 с.

**Арабей, Л. Л.** Стану песней... : документальная повесть [об Алоизе Пашкевич] / Лидия Арабей. — М. : Советский писатель, 1982. — 239 с.

**Арабей, Л. Л.** Стану песняй…: Жыццё і творчасць Цёткі : дакум. аповесць / Лідзія Арабей. — 2-е выд., дап. і дапрац. — Мінск : Маст. літ., 1990. — 268, [2] с.

**Коўтун, В. М.** Крыж міласэрнасці : раман : [у 2 кн.] / Валянціна Коўтун. — Мінск : Маст. літ., 1988. — Кн. 1. — 1988. — 63, [1] с.

**Коўтун, В. М.** Крыж міласэрнасці : раман : [для старэйшага школьнага ўзросту] / Валянціна Коўтун. — Мінск : Маст. літ., 1996. — (Школьная бібліятэка). — 491, [2] с.

**Koutun, V.** Gailestingumo kryzius : romanas / Valiancina Koutun. — Vilnius : Alma littera, 1997. — 494, [1] с.

**Марціновіч, А.** Элаіза Пашкевіч. Цётка усіх беларусаў / Алесь Марціновіч. — Мінск : Харвест, 2013. — (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры). — 63, [1] с.

**Тетка** // Республика Беларусь : энциклопедия: [в 6 т.] / редкол. : Г. П. Пашков (главный редактор [и др.]. — Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2008. — Т. 7. — С. 217.

**Цётка** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 2003. — Т. 17. — С. 110—111.

**Цётка** // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : [у 12 т.] / рэдкал.: П. У. Броўка (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 1974. — Т. 11. — С. 108—109.

**Цётка** // Беларусь: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1995. — С. 748.

**Цётка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя / [рэдкалегія: Л. С. Ананіч і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя. Т. 9, кн. 3. — 2017. — С. 756—757.

**Цётка** // Культура Беларусі : энцыклапедыя: [у 6 т.] / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд. [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2015. — Т. 6. — С. 434—435.

**Цётка** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск, 1987. — Т. 5. — С. 472—473.

***

**Дудзюк, З. І.** Сляды мінулага / Зінаіда Дудзюк // Маладосць. — 2025. — № 12. — С. 97—107.

**Зяткіна, Н. М.** Цётка. "Шануйце роднае слова!". Патрыятычны пафас артыкула : (урок у 7-м класе) / Н. М. Зяткіна // Беларуская мова і літаратура. Серыя "У дапамогу педагогу". — 2025. — № 3. — С. 28—32.

**Чарнавокая, А. М.** Фемінныя персанажы ў беларускай прозе 1910—1920-х гадоў / Аляксандра Чарнавокая // Роднае слова. — 2025. — № 3. — С. 19—23.

**Карчашкіна, Д.** Праблемы атрыбуцыі дубіяльных тэкстаў у творчай спадчыне Алаізы Пашкевіч (Цёткі): біяграфічна-ідэалагічны і стылістычны аспекты / Дарыя Карчашкіна // Роднае слова. — 2024. — № 1. — С. 17—19.

**Карлюкевіч, В.** Жанчына з бунтарскай душой : вершы Цёткі ўпершыню перакладзены на кітайскую мову / Вераніка Карлюкевіч // Belarus. — 2023. — № 9. — С. 70—73.

**Навасельцава, Г. В.** Мастацкае асэнсаванне асобы пісьменніка і грамадскай рэчаіснасці пачатку ХХ стагоддзя ў беларускім рамане 1980—90-х гадоў / Ганна Навасельцава // Беларуская думка. — 2022. — № 9. — С. 89—95.

**Бязручка, Л.** Ян Чачот, Янка Лучына, Алаіза Пашкевіч: жыццёвы шлях і творчасць : інтэлектуальная гульня (10—11-я класы) / Леанід Бязручка // Роднае слова. — 2021. — № 7. — С. 73—74.

**Вяршыла, Н.** Цётка. Вершы "Мае думкі", "Вера беларуса", "Мора" : урок беларускай літаратуры ў 10 класе / Н. Вяршыла // Бібліятэка прапануе. — 2021. — № 4. — С. 10—13.

**Есіс, Я. В.** Вобраз Алаізы Пашкевіч (Цёткі) у рамане "Крыж міласэрнасці" Валянціны Коўтун : урок беларускай літаратуры (10-ы клас) / Яўген Есіс // Роднае слова. – 2021. — № 7. — С. 68—70.

**Карчашкіна, Д.** Жанравая спецыфіка празаічных твораў малой формы ў спадчыне Цёткі і Змітрака Бядулі / Дарыя Карчашкіна // Маладосць. — 2021. — № 3. — С. 91—94.

**Куляшова, Н.** Інтэрактыўная гульня "Хто жадае стаць выдатнікам?", або Беларуская літаратура на 10 балаў : пазакласнае мерапрыемства па літаратуры для 5–9 класаў, прысвечанае пісьменнікам-юбілярам 2021 года / Н. Куляшова // Бібліятэка прапануе. — 2021. — № 7. — С. 31—34.

**Петрашкевіч, М.** Цётка беларускага народа : гульня (8–10-я класы) / Марына Петрашкевіч // Роднае слова. — 2021. — № 7. — С. 71—73.

**Карчашкіна, Д.** Першае беларускае апавяданне пра студэнцкую моладзь / Дарыя Карчашкіна // Маладосць. — 2019. — № 12. — С. 106—110.

**Трус, М. В.** Беларуская літаратура ў ЗША (пачатак XX ст.): архіўныя знаходкі і канцэптуальна новы культуралагічны дыскурс / Мікола Трус // Полымя. — 2019. — № 9. — С. 85—96.

**Бартошык, Ю.** Бліскавіца на небе беларускасці / Юрась Бартошык // Полымя. — 2016. — № 7. — С. 145—164.

**15 ліпеня — 140 гадоў з дня нараджэння Цёткі (А. С. Пашкевіч)** (1876—1916), грамадска-культурнай дзеячкі, пісьменніцы, асветніцы, педагога, выдаўца, удзельніцы рэвалюцыйнага руху : бібліяграфічны спіс / складальнікі: В. Я. Асаёнак, Г. В. Брага, Н. А. Шашэнька ; рэдактар К. Д. Варанько // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (ліпень — верасень). — 2016. — № 5. — С. 7—10.

**Смолка, В. В.** "Я буду жыць ..." : да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі / Вікторыя Смолка // Белая Вежа. — 2016. — № 7. — С. 13—17.

**Фіцнер, Т. А.** Жаночыя вобразы рамана "Крыж міласэрнасці" Валянціны Коўтун праз прызму "жаночага чытання": вобраз Цёткі / Таццяна Фіцнер // Роднае слова. — 2016. — № 4. — С. 12—15.

**Сабуць, А. Э.** «Лучынка» Алаізы Пашкевіч злучыла эпохі : да 100-годдзя выдання / Аліна Сабуць // Роднае слова. — 2014. — № 4. — С. 13—17.

***змест***